Нацыянальны інстытут адукацыі

**Кампетэнтнасны падыход**

**І. А. Пінголь**

# Беларуская літаратура

## 8 клас

## Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Сэр-Віт»
2019

# Прадмова

Навучанне літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі паводле канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літарататура»[1] абумоўлена практычнай накіраванасцю і сарыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмнага, аксіялагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага, культуралагічнага і культуратворчага падыходаў пры выкладанні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай літаратуры.

У сучаснай адукацыі на першы план выходзіць фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці, якая разумеецца як здольнасць выкарыстоўваць набытыя веды, уменні і навыкі для рашэння максімальна шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах дзейнасці і сацыяльных узаемаадносін. У такім кантэксце галоўнай мэтай навучання беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца фарміраванне дзейснага чытача – асобы з высокім узроўнем чытацкай пісьменнасці і здольнасцямі да каштоўнасна-сэнсавага засваення твораў літаратуры як мастацтва слова. Такое спалучэнне функцыянальнага, аксіялагічнага і мастацка-эстэтычнага аспектаў літаратурнай адукацыі стварае ўмовы для выхавання сродкамі беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета чытача матываванага (на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі), чытача кампетэнтнага (на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі) і чытача кваліфікаванага (на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі).

У выніку дасягнення мэт і задач літаратурнай адукацыі фарміруюцца наступныя прадметныя кампетэнцыі:

*літаратурная*, якая накіравана на засваенне вучнямі ведаў пра літаратуру як сістэму, сфарміраваных у выглядзе паняццяў і рэалізаваных у разнастайных спосабах дзейнасці, і праяўляецца ў асобасным ўспрыманні, засваенні і асэнсаванні мастацкіх тэкстаў, фарміраванні ў яго чытацкай культуры, літаратурных і эстэтычных густаў;

*каштоўнасна-светапоглядная*, якая сведчыць пра засваенне сістэмы каштоўнасных адносін да рэчаіснасці, да людзей, да сябе, зафіксаванай у творах беларускай літаратуры;

---

[1] Праскаловіч В., Шаўлякова-Барзенка, І. Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (V – XI класы): Праект / В. Праскаловіч, І. Шаўлякова-Барзенка // Роднае слова. – 2016. – № 3. – С. 51–62.

*маўленчая* – авалоданне асноўнымі відамі маўленчай дзейнасці (вуснай, пісьмовай, сітуацыйнай і г. д.);

*камунікатыўная* – набыццё вопыту камунікатыўнай дзейнасці праз ажыццяўленне дыялогу з тэкстам мастацкага твора, яго аўтарам, іншымі чытачамі, адзінкавым тэкстам і мноствам кантэкстаў;

*культуралагічная кампетэнцыя* – усведамленне вучнямі літаратуры як феномена культуры, нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай літаратуры; здольнасць карыстацца культуразнаўчай інфармацыяй для патрэб камунікацыі;

*культуратворчая* – набыццё вопыту культуратворчай дзейнасці: авалоданне сістэмай цэласных аперацыйных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці.

Прапанаваныя дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы з'яўляюцца сродкам для фарміравання ў вучняў як ужо акрэсленых прадметных, так і метапрадметных і асобасных кампетэнцый. Заданні маюць комплексны характар, бо накіраваны на фарміраванне адначасова некалькіх кампетэнцый. Пры іх выкананні вучням дзеля засваення вучэбнага матэрыялу неабходна ажыццявіць дзейнасць рознага віду: пазнавальную, камунікатыўную, пошукавую, творчую і інш. Пры гэтым заданні патрабуюць не столькі аднаўлення інфармацыі ці асобных дзеянняў, колькі дзейнасці вучня па асэнсаванні літаратурных твораў і з'яў з пазіцыі сваёй асобы.

Асновай задання часцей за ўсё з'яўляецца тэкст літаратурнага твора ці літаратурна-крытычнага артыкула, да якога прапануецца пэўная задачная фармулёўка. Яна дакладна ўказвае на тыя спосабы дзейнасці, якія вучню неабходна ажыццявіць для выканання задання. Напрыклад:

*«У лірычных творах у цэнтры ўвагі знаходзіцца ўнутраны свет чалавека, а сюжэтам з'яўляецца не счапленне падзей, а рух пачуццяў і настроеў. Перачытайце верш Максіма Багдановіча «Раманс» («Зорка Венера ўзышла над зямлёю...»), вылучыце словы, ключавыя для разумення пачуццяў лірычнага героя і на іх аснове вызначце яго настрой, адчуванні і думкі».*

У пэўных заданнях алгарытм дзеянняў вучняў задаецца праз шэраг пытанняў і заданняў. Напрыклад,

*«Перачытайце апісанне сустрэчы Сцяпана з маці. Прасачыце за зменай пачуццяў героя. Пра што яны сведчаць? Прыгадайце іншыя*

*эпізоды апавядання, дзе вобраз маці падаецца аўтарам праз успрыманне сына. Якім чынам яны характарызуюць героя?»*

Да некаторых заданняў прапанаваны бланк адказу, які задае структуру прад'яўлення вучнямі вынікаў сваёй дзейнасці па выкананні задання. Напрыклад:

| ***Тэкст байкі*** | ***Рэжысёрскія рэмаркі*** |
|---|---|
| *І вось адзін тут Падсвінак,*<br>*Які заўважыў бруд раней,*<br>*І кажа:*<br>*– Дзядзечка, твой лыч у брудзе!*<br>*Нязграбна гэта й між свіней,*<br>*А што ж, калі заўважаць людзі?* | |

Пэўныя заданні маюць творчы характар і арыентуюць вучняў на прымяненне атрыманых ведаў у новай сітуацыі і для рашэння жыццёвых задач. Заданні і пытанні павышанай цяжкасці пазначаны зорачкай (*). Напрыклад:

*«Уявіце, што вы – мастак-афарміцель зборніка, у які ўключаны творы Р. Барадуліна "Трэба дома бываць часцей...", В. Карамазава "Дзяльба кабанчыка" і А. Дударава "Вечар". Прыдумайце вокладку да гэтага выдання. Стварыце яе эскіз або дайце слоўнае апісанне».*

Дыдактычныя і дыягнастычныя заданні прызначаны для ацэнкі якасці разумення мастацкага твора, сфарміраванасці аналітычных, маўленчых і літаратурна-творчых уменняў, здольнасці выкарыстоўваць іх на практыцы, самастойнасці ацэнак падзей і характараў у мастацкіх творах, іх аргументаванасці і накіраваны на развіццё вобразнага мыслення і ўяўлення падлеткаў, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да вывучаемага твора. Выкарыстанне дадзеных матэрыялаў у працэсе навучання беларускай літаратуры стварае ўмовы для павышэння цікавасці да чытання і развіцця станоўчай вучэбнай матывацыі ў вучняў.

Прапанаваныя заданні могуць быць выкарыстаны для арганізацыі індывідуальнай, парнай і групавой работы вучняў як непасрэдна на ўроку, так і на факультатыўных занятках, у рабоце

з высока матываванымі і філалагічна адоранымі вучнямі пры падрыхтоўцы да прадметнай алімпіяды, а таксама прапанаваны ў якасці дамашняга задання.

Дыдактычныя матэрыялы мэтазгодна задзейнічаць на аперацыйна-пазнавальным этапе ўрока для замацавання ведаў, развіцця чытацкіх уменняў, фарміравання прадметных кампетэнцый, а таксама для правядзення бягучага кантролю.

Дыягнастычныя ж матэрыялы маюць падагульняючы характар, таму прызначаны для ацэначна-карэкцыйнага этапу ўрока, яны накіраваны на выяўленне сфарміраванасці прадметных кампетэнцый (у кожным заданні акрэслена, якая з іх з'яўляецца вядучай пры яго выкананні) і могуць быць выкарыстаны для правядзення як бягучага, так і тэматычнага кантролю. Мэтазгоднасць выкарыстання таго ці іншага задання настаўніку варта вырашаць зыходзячы з канкрэтнай адукацыйнай сітуацыі і індывідуальных магчымасцей вучняў.

Прапанаваныя заданні патрабуюць ад вучняў індывідуальна-асобаснага ўспрымання літаратуры як мастацтва слова. Пры ацэнцы іх выканання настаўніку варта заахвочваць самастойнасць думкі падлеткаў, улічваць аргументаванасць і пераканаўчасць довадаў, арыгінальнасць падыходаў да вырашэння задачы. Менавіта:

- веданне вучнем зместу вывучаных твораў, значэння літаратуразнаўчых тэрмінаў, азначаных вучэбнай праграмай;
- разуменне ўзаемасувязі падзей, учынкаў, характараў персанажаў і важнейшых сродкаў іх паказу (у адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы);
- матываванасць адбору эпізодаў, малюнкаў, дэталяў, мастацкіх сродкаў і інш. для вырашэння пастаўленай вучэбнай задачы;
- абгрунтаванасць асобаснай ацэнкі вывучанага твора яго ідэйна-мастацкім зместам;
- творчы, арыгінальны падыход да выканання задання.

Пры выстаўленні адзнакі за выкананне задання настаўніку неабходна зыходзіць з паказчыкаў ацэнкі вуснага і пісьмовага выказвання, пазначаных у нормах ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура».

## Умоўныя абазначэнні

 – задачная фармулёўка

 – тэкст для аналізу або дадатковая (ці дапаможная) інфармацыя

 – бланк адказу

 – мадэльны адказ

 – спасылка на электронны адукацыйны рэсурс, размешчаны на Нацыянальным адукацыйным партале ў раздзеле «Дыстанцыйнае навучанне»

# ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## *Да раздзела* І. Роды мастацкай літаратуры

### *Заданне 1*

Перачытайце верш Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей». Якая часціна мовы з ужытых у тэксце верша найбольш дапамагае зразумець яго асноўную думку? Адзначце правільны адказ:

а) назоўнік; б) прыметнік в) дзеяслоў.

Знайдзіце ў тэксце верша і запішыце словазлучэнні, якія з'яўляюцца адказам на пытанне: «Не забыць / помніць (каго / што)?» Якім чынам яны дапамагаюць зразумець вобраз роднага дома, створаны Рыгорам Барадуліным?

| | |
|---|---|
| ***Не забыць / помніць*** | |
| | |

Верш пачынаецца і заканчваецца амаль аднолькавай страфой, у тэксце сустракаюцца шматлікія паўторы. Якім чынам праз такую асаблівасць будовы твора раскрываецца яго асноўная думка (мастацкая ідэя)?

### *Заданне 2*

Вызначце эпізоды, якія паказваюць развіццё сюжэта ў апавяданні В. Карамазава «Дзяльба кабанчыка».

| | |
|---|---|
| ***Завязка*** | |
| ***Развіццё дзеяння*** | |
| | |
| ***Кульмінацыя*** | |
| ***Развязка*** | |

Хто з герояў апавядання, на вашу думку, «душою стаў чысцей»? Чаму?

### *Заданне 3*

Перачытайце апісанне сустрэчы Сцяпана з маці. Прасачыце за зменай пачуццяў героя. Пра што яны сведчаць?

Маці выйшла з хаты. Два пустыя вядры ў руцэ — ішла па ваду. Сына заўважыла — спынілася пад акном. У рыжым, старым, кругом палатаным кажусе, у шарсцяной хустцы, якую Сцяцан купляў у Мінску яшчэ да арміі.

— Ну што ты стаіш? — спытала зводдаль і замоўкла, адно вачыма лагодна ўсміхнулася, нібы казала-клікала: ну падыдзі да мяне, сынок...

Вёдры на зямлю паставіла, сама падышла.

Упартая стрыманасць у Сцяпанавай натуры змалку: руку падаў і больш — ані знаку, што рады сустрэчы з домам, з маці. Але гэта — адно першая хвіліна. Потым як глянуў маці ў вочы, малыя, нявінныя, нейкія галубіныя, з самотнай пякучай чырванню, у гусцейшых, як апошні раз, калі бачыліся, маршчынах, сэрца скранулася: сунуўся халодным носам у матчын твар, пацалаваў у шчаку. Ад непрывычкі засаромеўся сваіх раптоўных пачуццяў — адхінуўся, апусціў вочы, быццам не ведаў, як апраўдацца.

Узгадайце іншыя эпізоды апавядання, дзе вобраз маці падаецца аўтарам праз успрыманне сына. Якім чынам яны характарызуюць героя?

### *Заданне 4*

Успомніце, які сон сніўся Сцяпану. Што, на вашу думку, хацеў у сне сказаць сын бацьку? Якім чынам гэты эпізод суадносіцца з фіналам апавядання?

### *Заданне 5*

Размяркуйце паміж героямі п'есы Аляксея Дударава «Вечар» цытаты, якія іх характарызуюць. Запішыце нумары цытат у адпаведную графу табліцы.

| *Мульцік* | *Гастрыт* |
|---|---|
| | |

## Змест


Прадмова . . . 3
Умоўныя абазначэнні . . . 7
**Дыдактычныя матэрыялы** . . . 8
Да раздзела I. Роды мастацкай літаратуры . . . 8
Да раздзела II. Лірычныя жанры . . . 11
Да раздзела III. Эпічныя жанры . . . 17
Да раздзела IV. Ліра-эпічныя жанры . . . 20
Да раздзела V. Драматычныя жанры . . . 24
**Дыягнастычныя матэрыялы** . . . 26
Да раздзела I. Роды мастацкай літаратуры . . . 26
Да раздзела II. Лірычныя жанры . . . 28
Да раздзела III. Эпічныя жанры . . . 30
Да раздзела IV. Ліра-эпічныя жанры . . . 32
Да раздзела V. Драматычныя жанры . . . 36
**Выкарыстаная літаратура** . . . 39